# КРАЯЗНАЎЧАЯ ЭКСКУРСІЯ
# «МОЙ РОДНЫ КРАЙ»

**Аўтар:** экскурсавод этнаграфічна-краязнаўчага музея “Спадчына” ДУА “Турэц-Баярская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна” Алісейка Максім Сяргеевіч.

**Кіраўнік:** Крупская Святлана Мікалаеўна, кіраўнік музея, педагог дадатковай адукацыі.

Маршрут экскурсіі «Мой родны край» распрацаваны на аснове экскурсійнага маршрута па вёсцы Турэц-Баяры і г. Маладзечна.

**Мэта экскурсіі:** дапамагчы вучням у вывучэнні гісторыка- культурнай спадчыны малой Радзімы і яе сучасных дасягненняў.

**Задачы экскурсіі:**
- пазнаёміць з гісторыяй г. Маладзечна і  гісторыяй роднай вёскі;
- фарміраваць гістарычную свядомасць вучняў;
- выхоўваць павагу да роднага краю, пачуццё гонару за сваю Радзіму, за сваіх землякоў;
- стварыць інфармацыйны краязнаўчы маршрут.

Кантрольны тэкст экскурсій па распрацаванаму маршруту сфарміраваны адпаведна тэхналагічнай карты маршрута і прадстаўленага матэрыялу даследванняў аб'ектаў, які дазваляе праводзіць як аглядную экскурсію па г. Маладзечна, так і тэматычныя экскурсіі па асобных аб’ектах маршруту. Экскурсія, у такім выпадку, будзе мець наступную структуру:
- знаёмства з гісторыяй ўтварэння вёскі Турэц- Баяры, паходжаннем назвы вёскі;
-знаёмства з гісторыяй утварэння г. Маладзечна, яго геаграфічным становішчам і помнікамі гісторыі і архітэктуры, якія размешчаны на тэрыторыі раёна;
Працягласць – 6 г. 15 хвілін

# Нітка маршрута «Мой родны край»

Маршрут: вакзал станцыі Пруды – чыгуначны вакзал г. Маладзечна – вакзал станцыі Пруды.



**Тэхналагічная карта маршрута экскурсіі «Мой родны край»**

Маршрут: в. Турэц-Баяры – г. Маладзечна – в. Турэц-Баяры.

Працягласць – 6 г. 15 хвілін

Знаёмства экскурсавода і экскурсантаў, азнаямленне з мэтай экскурсіі. Правядзенне інструктажу па тэхніцы бяспекі на чыгуначнай станцыі, у час паездкі на чыгуначным транспарце і аўтобусе (10 хв.)

| Маршрут | Прыпынкі | Аб'екты паказу | Час | Назвы падтэм і пералік асноўных пытанняў, якія раскрываюць тэму | Арганізацыйныя пытанні | Метадычныя ўказанні |
|---|---|---|---|---|---|---|
| **Уступ** | | | | | | |
| ДУА “Турэц-Баярская сярэдняя школа Маладзечанскага раёна”. Вул. Цэнтральная, 14. | Памяшканне школьнага краязнаўчага музея “Спадчына” | Школьны краязнаўчы музей | 30 хв. | 1.Кароткія звесткі пра гісторыю ўзнікнення Турэц-Баярскай СШ і стварэнне ў ёй этнаграфічна-краязнаўчага | Знаёмства з правіламі паводзін у час экскурсіі, парадку перамяшчэння, размяшчэння на месцах прыпынкаў, мер бяспекі і парадак | Расказ аб гісторыі вёскі пачаць падчас руху па вуліцах вёскі. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | музея. | задачы пытанняў . | |
| в. Турэц – Баяры<br><br>в. Турэц – Баяры | Пляцоўка перад сельскай бібліятэкай<br><br>Пляцоўка перад дзіцячым садком | Вул. Цэнтральная, 13.<br><br>Вул. Цэнтральная, 13 | 15 хв.<br><br>15 хв. | 1. Кароткія звесткі пра гісторыю ўзнікнення вёскі Турэц-Баяры, паходжанне назвы вёскі.<br>2.Гісторыя ўзнікнення пасёлка Турэц-Баяры, яго сучасны выгляд. | Прапанаваць групе размясціцца паўкругам не больш чым у два рады. | |
| Станцыя “Пруды” | Памяшканне станцыі «Пруды» | | 15 хв. | 1. Станцыя «Пруды»: мінулае і сучаснасць. | Прапанаваць групе размясціцца паўкругам не больш чым у два рады. | Аповед аб гісторыі станцыі “Пруды” правесці ў памяшканні станцыі. |
| **Пераезд на станцыю г. Маладзечна на цягніку рэгіянальных ліній.<br>Свабодныя зносіны. Адпачынак.<br>30 хв.** | | | | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Вакзал станцыі Маладзечна, пешшу | Прывакзальная плошча | Памяшканне станцыі Маладзечна | 20 хв. | 1.Станцыя Маладзечна: мінулае і сучаснасць. | Група размяшчаецца паўкругам. | Пры правядзенні экскурсіі даць сціснутую даведку аб гісторыі вакзала. |
| Г. Маладзечна | Шаша Маладзечна-Вілейка | Рэшткі феадальнага замка | 30 хв. | 1. Феадальны замак; гісторыя і перспектывы ў будучыні. | Група размяшчаецца паўкругам ,такім чынам, каб рэшткі феадальнага замка былі справа ад яе. | Пры правядзенні экскурсіі даць сціснутую даведку аб гісторыі замка. Акцэнтаваць увагу на былых гаспадарах замка.<br><br>Пры расказе выкарыстоўваць партфель экскурсавода з карта-схемай замка, або фатаздымкам-панарамай ці планам замкавага комплекса, а таксама старымі фатаздымкамі. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Г. Маладзечна | Шаша Маладзечна-Вілейка | Помнік аб Айчыннай вайне 1812 года | 30 хв. | 1. Горад Маладзечна падчас Айчыннай вайны 1812 года. | Група размяшчаецца паўкругам, такім чынам, каб камень быў злева ад яе. | Пры падыходзе да камня-валуна пака-заць распалажэнне і дзеянні рускіх і французскіх войск. Выкарыстаць прыём паказу мемарыяль-най дошкі. |
| Г. Маладзечна | Вул. Замкавая | “Мемарыяльны комплекс “Шталаг №342” | 40 хв. | 1. Горад падчас Вялікай Айчыннай вайны. Значымасць помніка “Мемарыяльны комплекс “Шталаг № 342”. | Група размяшчаецца паўкругам ,такім чынам, каб “Мемарыяльны комплекс “Шталаг – 342” быў перад групай. | Падчас наведвання помніка яшчэ раз нагадаць пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны, пра гісторыю стварэння “Мемарыяльнага комплексу “Шталаг № 342”. Расказаць пра под-звіг беларускага народа падчас Вялікай Айчыннай вайны і ролю пар-тызанскіх атрадаў у вызваленні краю. |

<table>
<tr><td colspan="7">Пераезд па г. Маладзечна на транспарце гарадскіх ліній да Лядовага палаца.<br>Свабодныя зносіны. Адпачынак.<br>20 (хв.)</td></tr>
<tr><td>Г. Маладзечна, пешшу</td><td>Вул. Вялікі Гасцінец, 102.</td><td>Лядовы палац</td><td>30 хв.</td><td rowspan="3">1. Горад Маладзечна: мінулае і сучаснасць.<br>2. Кароткія звесткі з гісторыі музычнага каледжа імя М. К. Агінскага</td><td>Група выходзіць з аўтобуса і размяшчаецца каля галоўнага ўвахода ў палац. Унутр палаца група не заходзіць.</td><td rowspan="2">Расказ аб гісторыі горада пачаць падчас руху па вуліцах горада.<br><br>Выкарыстоўваць прыём панарамнага паказу. Даць характарыстыку сучаснага горада і яго гісторыі.</td></tr>
<tr><td>Г. Маладзечна, пешшу</td><td>Плошча Цэнтральная,4</td><td>Палац культуры</td><td>30 хв.</td><td>Група размяшчаецца каля галоўнага ўвахода ў палац. Унутр палаца група не заходзіць. Калі ёсць дадатковы час, экскурсавод праводзіць групу па сцежках парку.</td></tr>
<tr><td>Г. Маладзечна, пешшу</td><td>Вул. Вялікі Гасцінец, 52.</td><td>Музычны каледж імя М.К. Агінскага</td><td>30 хв.</td><td>Група размяшчаецца каля галоўнага ўвахода ў каледж. Унутр каледжа група не заходзіць.</td><td>Выкарыстоўваць прыём панарамнага паказу.</td></tr>
</table>

**Пераезд на станцыю Пруды на цягніку рэгіянальных ліній.**
**Свабодныя зносіны. Адпачынак.**
**30 хв.**
**Падвядзенне вынікаў экскурсіі. Дзелімся ўражаннямі.**



1. Перспектыва рэканструкцыі Маладзечанскагазамка.



2. Камень-валун, які нагадвае аб вайне 1812 г.




3. Мемарыяльны комплекс “Шталаг342”.



4. Палац культуры.




5. Лядовы палац “Алімпік-2011”




6. Музычны каледж імя М.К.Агінскага



7. Ст. Пруды